**Матырка, В.** Голуб з Забаення / В. Матырка // Лепельскі край. — 2009. — 9 студз. — С. 7.

## ГОЛУБ З ЗАБАЕННЯ

Алег Голуб родам з Забаення. Яго бацька Дзмітрый Рыгоравіч і маці Галіна Станіславаўна там жа нарадзіліся і пражылі ўсе жыцце. Бацька працаваў шафёрам у аўтабазе, а потым у леспрамгазе, а маці доўгі час была фасоўшчыцай на МКК, працавала на ферме. Алег скончыў восем класаў СШ № 2, а потым Лепельскае СПТВ-175, стаў вадзіцелем. Яшчэ са школы займаўся вольнай барацьбой пад кіраўніцтвам трэнера Віктара Шыця, на абласных спаборніцтвах заняў другое месца.

– Трэніраваў нас Віктар Віктаравіч сур´езна, – успамінае Алег, – Барацьба мацавала сілу і загартоўвала характар.

17 кастрычніка 1985 года Алега прызвалі ў армію. Адразу не казалі, куды накіроўваюць. Пра гэта даведаліся толькі на размеркавальным пункце ў Барысаве. Цягніком даехалі да Тэрмеза – аднаго з самых паўдневых пунктаў савецкага Саюза. Прайшоў курс маладога байца – тры месяцы ў вучэбцы пал палаючым сонцам. А вучылі іх афіцэры, прапаршчыкі і сяржанты, якія самі прайшлі Афган, мелі баявы вопыт, ведалі прыродныя ўмовы.

У пачатку 1986 года пераляцелі за мяжу. 180 мотастралковы полк, у якім служыў Алег, дыслакаваўся на ўскраіне Кабула і складаўся з трох баявых батальенаў. Адзін прыкрываў месца размяшчэння палка. Асабовы склад другога раскіданы па апорных пунктах па ўсей тэрыторыі Афганістана, а з байцоў і афіцэраў трэцяга батальёна камплектавалі групы, якія хадзілі ў рэйды і засады таксама па ўсім Афганістане. Алега залічылі ў трэці. Камбат Руслан Аушаў неўзабаве стаў начальнікам штаба палка, а ў хуткім часе і генералам. У 90-х яго выбралі прэзідэнтам Інгушэціі. Камандаваў палком Герой Савецкага Саюза Высоцкі.

– Строгі быў камбат, але справадлівы, – расказвае Алег.

***– Параўнайце нашу зброю і зброю душманаў.***

– У нас была нядрэнная зброя і баявая тэхніка. Але асабліва духі баяліся нашай авіяцыі. Асабіста мне даручылі асвоіць новы на той час узор – АГС - аўтаматычны гранатамёт на станку. Ён чэргамі выстрэльваў гранаты, вельмі быў эфектыўны. Асвойваў зброю спецыфічна: зачынілі мяне ў пакоі з гранатамётам, дапаможнікам да яго і сказалі, што выпусцяць толькі тады, калі вывучу яго назубок. Толькі праз суткі выйшаў. Літаральна назаўтра выхад на аперацыю, там і праверыў яго дзеянне на практыцы. За год так напрактыкаваўся, што мог за паўкіламетра патрапіць у карабок запалак, навват прыцэл да АГС не браў. У духаў жа былі аўтаматы Калашнікава кітайскай вытюрчасці, англійскія вінтоўкі "бур", амерыканскія "стынгеры". "Буры" ў большасці былі вырабу 40-50-ых гадоў, але вызначаліся выключнай магутнасцю і трапнасцю бою. Снайпер з "бурам" мог паражаць цэлі на ад-легласці тры і больш кіламетраў, куля прабівала браню БМП з фальшбартамі. "Стынгерамі" ж яны збівалі самалёты і верталёты.

***– Кого з баявых сяброў успамінаеце?***

– Ва ўзводзе быў у мяне добры прыяцель Проша з Саратава. Нават пасля службы з ім перапісваўся. Прозвішча яго было Прохараў, таму мянушку далі Проша, а імя ніхто і не памятае. Там ва ўсіх былі кароткія мянушкі, каб у запале бою хутка паклікаць байца. Мяне, напрыклад, з-за прозвішча Голубь называлі  Птушкай. Служылі там і землякі Гена Бельскі, Віктар Крывічанін, Пеця

Міснік. За два гады службы ў Афгане Алег Голуб быў чатыры разы прадстаўлены да ўзнагароджання ордэнам Чырвонай Зоркі, але атрымаў толькі медалі "За адвагу" і "За воінскую доблесць". За ўвесь час ён не быў ні разу сур'ёзна паранены, хаця ўдзельнічаў у 37 выхадах на аперацыі і 12 засадах. Магчыма, аберагала малітва на паперы, якую прыслала маці, каб сын зашыў яе ў форму.

***– Як ваяваў праціўнік?***

– Гэта была партызанская вайна, і адкрытага бою духі стараліся пазбягаць, нападалі больш з засад. Аднойчы ў Пандшэрскай цясніне мы сутыкнуліся з атрадам наёмнікаў. Там ваявалі і амерыканцы, і італьянцы, і салдаты ўдачы іншых нацыянальнасцей. Яны так наваліліся, што рота спешна адступала. Потым іх накрыла наша артылерыя і авіяцыя.

Дадому Алег Голуб вярнуўся ў пачатку лістапада 1987 года. Папрацаваў крыху ў леспрамгасе, потым будаваў па прыватных заказах, у Маскву на заробкі ездзіў. Жыве ў бацькоўскай хаце ў Забаенні.

**Васіль Матырка**